*А. С. Бохан*

# КОЛЕР Ў МАСТАЦКА-ВОБРАЗНАЙ СІСТЭМЕ ТРАДЫЦЫЙНАГА БЕЛАРУСКАГА АРНАМЕНТУ

Колер у арнаментах выразна выступае ў якасці кампазіцыйнага фактару, дазваляе мяняць унутраны строй узораў. Выкарыстанне чаргавання колераў дае магчымасць вар'іраваць дынаміку кампазіцыйнай пабудовы.

Акрамя таго, колеравыя спалучэнні, характэрныя для беларускіх тканін, могуць разглядацца як адметная рыса традыцыйнага мастацтва. Даследчыкамі арнаменту адзначалася трываласць традыцыі афармлення тканін на ўсёй тэрыторыі Беларусі, адзінства ў тэхнічным выкананні і перавага бела-чырвона-чорных узораў [16, с.2; 18, с.33; 23, с.240]. Такая колеравая гама панавала ў дэкоры тканін да сярэдзіны XX ст. Паліхромнасць у аздабленні вышыванага адзення стала пашыранай толькі ў 1960-я гг. [17, с.28].

Мастацка-вобразная сістэма традыцыйнага геаметрычнага арнаменту, якая базіруецца на асноўнай колеравай трыядзе, сведчыць пра надзвычайную архаічнасць гэтай з'явы. Несумненна, што ў аснове гэтага спалучэння ляжаць агульначалавечыя ўяўленні ранніх эпох развіцця. Але сэнсавае напаўненне колеравай сістэмы надзвычай разнастайнае [15, с.33–63]. Успрыманне колеру залежала не толькі ад трансцэндэнтных адчуванняў, але і ад канкрэтных умоў існавання грамадства, спецыфікі пэўных міфалагічных уяўленняў.

Белы, чырвоны і чорны сталі аднымі з самых старажытных колеравых адзнак. Чырвоны і на сённяшні дзень з'яўляецца сакральным колерам многіх народаў. Хутчэй за ўсё, чырвоны (вохрысты) увогуле быў першым колерам, якім чалавек стаў выяўляць свае думкі і пачуцці. Радовішчы вохры, даступныя людзям на пэўным этапе развіцця чалавецтва, з'явіліся стымулам для інтэлектуальных практыкаванняў. Тое, што было часткай зямліпрамаці, пачало ўвасабляць розныя вобразы. Па сутнасці, чырвоны колер стаў новым сродкам зносін. «Чырвонай была кроў жывёл, якіх чалавек забіваў, і яго ўласная. Чырвоны агонь гарэў у вогнішчах пад навесамі скальных жытлаў неандэртальцаў. Сваім аранжава-чырвоным агнём грэла іх сонца» [22, с.279]. Невыпадкова, што і ў фальклоры беларусаў чырвоны колер часта меў семантычную суаднесенасць з сонцам [1, с.22].

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

Вельмі верагодна, што сучасная трактоўка чырвонага як колеру, што ўвасабляе чалавека (і чалавечае ў шырокім сэнсе – жыццё, жыццёвыя сілы, кроў), паходзіць ад біблейскай традыцыі. Імя першага чалавека азначае «чырвоная зямля» (гліна). Аднак такая трактоўка, вельмі распаўсюджаная ў беларускім мастацтвазнаўстве і фальклорных даследаваннях, падаецца недастаткова абгрунтаванай у дачыненні да колеравага вырашэння арнаменту традыцыйных тканін, сэнсавая насычанасць якога ўзыходзіць да язычніцкіх светаўяўленняў.

Трактоўкі значэння чырвонага колеру могуць кардынальна разыходзіцца. Так, існуе думка, што гэта мог быць колер ахвярапрынашэння і ўвогуле ўспрымаўся звязаным са смерцю і ўладаром падземнага свету. У якасці аргумента прыводзіцца старажытнаруская традыцыя хаваць нябожчыка ў чырвоных санках, рытуал трупаспалення (агонь-чырвоны), звычай старажытных арыяў апранаць у чырвонае асуджаных на смерць [4, с.46]. Яшчэ неандэртальцы рабілі рытуальныя пахаванні частак тушы аленя, пасыпаючы іх вохрай [20, с.163].

Аднак з іншых крыніц можна зрабіць процілеглыя высновы. Чырвоны колер мог увасабляць жыццё ў самым шырокім сэнсе. З чырвоным асацыіравалася кроў, народзіны, зрэшты і адраджэнне. У фальклорнай традыцыі чырвоны быў асноўным колерам, які характарызаваў станоўчыя аспекты, мог быць сімвалам эратычнага пачатку. Засцерагальную ролю выконвалі ў замовах чырвоныя атрыбуты. Элементы чырвонага ў адзенні былі рэгламентаваны падчас пэўных рытуалаў і размяшчаліся каля жыццёва важных зон. Шырока выкарыстоўвалася колератэрапія, некаторыя захворванні лячылі чырвоным колерам [10, с.561; 11, с.73–75].

Даследчыца В. Фадзеева адзначала, што чырвоныя ўзоры былі ў мінулым адзнакай замужняй жанчыны дзетароднага ўзросту, што чорны быў антонімам чырвонага і ўвядзенне чорнага было адзнакай пэўнага часу, што раўназначнае спалучэнне чырвонага з чорным – прыкмета новага часу [21, с.73]. Цяжка сказаць, ці варта ўспрымаць чорны як адзнаку часу. Хоць магчыма дапусціць, што калі чорны ўвасабляў падземнае боства, якое актывізуецца ў пэўны перыяд года, то сапраўды гэты колер мог служыць адзнакай часу. Аднак такія меркаванні можна разглядаць толькі як гіпотэзу.

Чырвоны колер шырока выкарыстоўваўся як жанчынамі, так і мужчынамі, прытым незалежна ад узросту. Напрыклад, ён

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

пераважае ў поясе – істотнай і знакавай дэталі традыцыйнага жаночага, мужчынскага, дзіцячага касцюма [12, с.40; 3, с.412].

Характэрна, што арнамент чырвонага колеру часта прысутнічае ў пахавальным і жалобным адзенні ўсходніх славян [13, с.202–205]. І ў той жа час на вясельным адзенні беларусаў XIX ст. зафіксаваны чырвона-чорныя арнаментальныя кампазіцыі [13, с.189]. Чырвоны колер увогуле актыўна выкарыстоўваўся ў вясельнай атрыбутыцы [8, с.62]. Этнографамі зафіксаваны на тэрыторыі Беларусі магічныя абрады, атрыбутамі якіх былі розныя рэчы чырвонага колеру, напрыклад кветкі, яблыкі [8, с.37–38]. Як правіла, гэта была любоўная магія, якая, несумненна, мае сувязі з сімволікай плоднасці. У даследаваннях язычніцкай культуры славян адзначаецца, што ідалы боства, якое ўвасабляла плоднасць і ўрадлівасць, павінны былі мець чырвоную афарбоўку [2, с.115]. І ўжо ў XX ст. зафіксаваны земляробчыя абрады, скіраваныя на павышэнне ўраджайнасці, з выкарыстаннем чырвонага [8, с.98–100].

Палярныя трактоўкі чырвонага колеру далі магчымасць польскаму даследчыку сімвалаў В. Капалінскаму зрабіць высновы пра адначасовае існаванне дзвюх трактовак чырвонага колеру. Ён вызначае «чырвоны мужчынскі» і «чырвоны жаночы», зыходзячы з устойлівай мадэлі бінальных супрацьлегласцей. Адпаведна першы чырвоны ёсць сімвал станоўчага, боскага, светлага, другі – колер таемных сіл, жывёльнай жарсці, магіі [24, с.56].

Белы колер, які найбольш шырока ўжываецца ў беларускім тэкстылі, – адзін з асноўных у спектры каляровай сімволікі. Розныя і трактоўкі сэнсавага значэння белага. Культуролаг У. Конан піша аб белым колеры як сімвале святасці, прыгажосці і маральнай чысціні [9, с.6]. Сапраўды, у сучаснай трактоўцы, найбольш пашыранай і характэрнай для хрысціянізаванага грамадства, белы колер ёсць сімвал дасканаласці, духоўнасці, вышняга жыцця, збавення і адраджэння, чысціні, надзеі. Аднак не трэба пакідаць без увагі і тое, што ў фальклорнай традыцыі многіх еўрапейскіх краін чыста белы ўбор лічыўся адзнакай чарадзеек. Яшчэ адзін факт дае магчымасць трактаваць белы як сімвал чысціні. У традыцыі многіх народаў белы строй – гэта ўбор кандыдата, які меў намер змяніць свой статус. Само слова «candidatus» азначае «апрануты ў белае». Па-сутнасці, белы з’яўляўся адным з асноўных колераў падчас ініцыяцыі [24, с.22]. Відаць, трактоўка белага як колеру святарства і далучаных мае надзвычай глыбокія карані.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Белае адзенне без арнаментальных аздобаў фіксавалася як пахавальнае ва ўсходніх славян. Часта і сваякі памерлых год насілі адзенне з мінімальнай колькасцю аздобаў ці зусім без аздаблення (па-сутнасці, белае) [13, с.96]. Трэба сказаць, што звычай насіць у знак жалобы цалкам чорнае адзенне не адзначаецца даследчыкамі традыцыйнай культуры славян.

Думкі даследчыкаў наконт пахавальнага касцюма разыходзяцца. Напрыклад, Л. Дучыц піша, што ў X–XIII стст. гэта былі святочныя ўборы [5, с.5]. А ў некаторых этнаграфічных даследаваннях XX ст. прыводзяцца звесткі пра белыя пахавальныя строі [8, с.62].

Магічныя абрады, якія першапачаткова павінны былі выконвацца агаленымі ўдзельнікамі, у канцы XIX – пачатку XX ст. выконваліся ў белых кашулях [13, с.122]. Такім чынам, можна зрабіць высновы, што аголенасць і белае адзенне былі тоеснымі паняццямі. Перакаўчай падаецца думка Я. Сахуты пра тое, што каларыстыка тканін вызначалася ў тым ліку і прыродным колерам ільнянога палатна [18, с.92]. Гэта значыць, што белы колер успрымаўся як фон, пазбаўлены інфармацыі, так бы мовіць «чысты аркуш», не толькі па аб’ектыўных прычынах (натуральны колер сыравіны), але ён быў замацаваны ў свядомасці як сімвал першаданасці, першароднасці, «неакультуранасці», чысціні.

Пры разглядзе арнаментальнай традыцыі беларускага тэкстылю няцяжка заўважыць, што белы быў полем, якое несла на сабе інфармацыю, увасобленую і ў чырвоным, і ў чорным колерах, прытым складнікі гэтай інфармацыі былі цесна звязаны паміж сабой. Цалкам магчыма, што чырвоны і чорны колеры маглі ўяўляцца ўвогуле як рэгламентаваныя носьбіты сакральнай інфармацыі. У залежнасці ад спалучэння ўзоры рознага колеру маглі мець розную сэнсавую нагрузку.

Думаецца, што могуць быць розныя варыяцыі «прачытання» колеравай сімволікі. Трэба мець на ўвазе, што ў большасці выпадкаў мы маем справу не з апазіцыяй двух колераў, а з колеравай трыядай. Па прынцыпу бінарных апазіцый звычайна супастаўляліся белы – чорны, маглі мець месца і супастаўленні чырвоны – чорны [7, с.452]. У многіх усходнеславянскіх народаў вядомыя імёны боства, у якіх так ці інакш вар’іруюцца спалучэнні «Белы бог» і «Чорны бог». Прытым адзначаецца, што гэта маглі быць і персанажы, якія знаходзяцца ў апазіцыі, і аб’яднаныя ў аднагрупавое боства розныя іпастасі [7, с.454].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

У еўрапейскай і ва ўсходняй традыцыі чорны прынята звязваць з боствам падземнага свету, увогуле «нізу». Шматлікія тлумачэнні чорнага як «злога» пачатку ў сваёй большасці адносяцца да тых часоў, калі чорныя падземныя сілы не маглі ўспрымацца станоўча. Зыходзячы з таго, што чорны быў звязаны з магутным і небяспечным боствам падземнага свету, можна зразумець, чаму ў некаторых мясцовасцях Беларусі чорны колер замяняўся на сіні. Таксама як слова «чорт» стараліся не гаварыць, а называлі яго «кадак».

Ужыванне чорнага колеру ў народнай традыцыі паказвае неадназначнасць яго трактоўкі: чорны не меў выключна адмоўнай семантыкі. Хутчэй за ўсё выключна змрочную трактоўку чорнага колеру трэба звязваць з устанаўленнем хрысціянства. Гэта можна сцвярджаць, прааналізаваўшы помнікі фальклору, якія да звяртаюцца так званай «чорнай» і «белай» магіі: калі белыя чараўнікі ў іх апелююць да Бога, Хрыста і Дзевы Марыі, то чорныя звяртаюцца да д’ябла [1, с.46]. Такім чынам, пра ўспрыманне чорнага колеру як выключна адмоўнага можна гаварыць толькі ў кантэксце хрысціянскай традыцыі.

У гэтым плане цікавае традыцыйнае для сучаснага чалавека змрочнае ўспрыманне чорнага і адначасова трывалае на Беларусі павер’е пра тое, што шанцуе тым, хто трымае чорную жывёлу [6, с.553]. Да таго ж у розных народаў захоўваецца паданне пра хтанічнае боства падземнага свету, якое з’яўляецца захавальнікам і дарыцелем скарбаў [4, с.189]. Па некаторых прыкметах Чарнабога звязваюць з боствам балтыйскіх славян Трыглавам. Характэрна, што гэта трохгаловае боства ўвасабляла валадарства над трыма царствамі: небам, зямлёй і падземным светам. Гэты персанаж звязваўся з любой траістай сімволікай, адным з атрыбутаў яго быў вараны конь. Цікава, што ў многіх культурах чорны колер асацыіраваўся з воднай прасторай і вадой увогуле [14, с.29], а значыць, меў сувязь з падземным боствам.

Паколькі істотнай рысай архаічнага міфалагічнага мыслення з’яўляюцца амбівалентнасць і полісемантычнасць вобразаў, пры аналізе колеравай трыяды ў першую чаргу трэба звярнуць увагу на тое, як колеры ўступалі ў апазіцыі. А з вышэйпрыведзенага можна зрабіць высновы, што чырвоны і чорны не апазіцыяніравалі беламу, а наносілі на яго інфармацыю. У той жа час чырвоныя і чорныя элементы ўступалі ў складаныя ўзаемасувязі, што першапачаткова магло азначаць выяўленне пэўных паняццяў, з цягам часу

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

спалучэнне чырвоных з чорным узораў трывала замацавалася, але прапорцыі выкарыстання гэтых колераў маглі мяняцца. Паступова майстрыхі, ужо кіруючыся ўласным густам, сталі ўжываць традыцыйныя колеры ў сваіх вырабах.

1. *Барташэвіч, Г. А.* Магічнае слова: вопыт даследавання светапогляду і мастацкай асновы замоў / Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 128 с.

2. *Волошина, Т. А.* Языческая мифология славян / Т. А. Волошина, С. Н. Астапов. – Ростов н/Д.: Феникс, 1996. – 448 с.

3. *Гісторыя* беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: Навука і тэхніка, 1987–1994. – Т. 3: Канец XVIII – пач. XX ст. / рэд. тома Л. М. Дробаў, П. А. Карнач. – 1989. – 448 с.

4. *Голан, А.* Миф и символ / А. Голан. – 2-е изд. – М.: РУССЛИТ, 1994. – 375 с.

5. *Дучыц, Л. У.* Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст. (паводле археалагічных звестак) / Л. У. Дучыц. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 80 с.

6. *Зайкоўскі, Э. М.* Чорны / Э. М. Зайкоўскі // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 553.

7. *Иванов, В. В.* Славянская мифология / В. В. Иванов, В. Н. Топоров // Мифы народов мира: энцикл.: в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М.: Сов. энцикл., 1982. – Т. 2. – С. 450–456.

8. *Казакова, І. В.* Міфалагемы і магія ў беларускім абрадавым фальклоры / І. В. Казакова. – Мінск: БОФФ, 1997. – 119 с.

9. *Конан, У. М.* Беларуская эстэтыка і мастацкая культура. Гісторыя, традыцыі, сучаснасць / У. М. Конан. – Мінск: Веды, 1988. – 23 с.

10. *Крук, І. І.* Чырвоны / І. І. Крук // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік. – Мінск: Беларусь, 2004. – С. 560–561.

11. *Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Ураджай, 2001. – 350 с.

12. *Лабачэўская, В. А.* Вера – не марная / В. А. Лабачэўская // Мастацтва. – 1993. – № 6. – С. 39–44.

13. *Маслова, Г. С.* Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах XIX – нач. XX в. / Г. С. Маслова. – М.: Наука, 1984. – 216 с.

14. *Миронова, Л. Н.* Учение о цвете / Л. Н. Миронова. – Минск: Выш. шк., 1993. – 463 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

*15. Миронова, Л. Н.* Цвет в изобразительном искусстве / Л. Н. Миронова. – Минск: Беларусь, 2002. – 151 с.

*16. Раманюк, М. Ф.* Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск: Беларусь, 1981. – 306 с.

*17. Раманюк, М. Ф.* Песні і строі Піншчыны / М. Ф. Раманюк, В. Д. Ліцьвінка. – Мінск: Беларус. ін-т праблем культуры, 1994. – 36 с.

*18. Сахута, Я. М.* Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: вучэб. дапам. / Я. М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 1996. – 110 с.

*19. Свістуновіч, С. С.* Народная вышыўка / С. С. Свістуновіч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1980. – № 1. – С. 32–34.

*20. Столяр, А. Д.* Происхождение изобразительного искусства / А. Д. Столяр. – М.: Искусство, 1985. – 298 с.

*21. Фадзеева, В. Я.* Вышыўка / В. Я. Фадзеева / Традыцыйныя рамёствы Беларусі: праграмы для дамоў рамёстваў. – Мінск: БелІПК, 1995. – С. 63–88.

*22. Художественная* культура первобытного общества / сост. И. А. Химик; под ред. М. С. Кагана.– СПб.: Славия, 1994. – 415 с.

*23. Цітоў, В. С.* Народная спадчына / В. С. Цітоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

*24. Kopalinski, W.* Slownik simboli / W. Kopalinski. –Warszawa: Wiedza Powszechna, 1991. – 512 s.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ